Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Полацкі дзяржаўны універсітэт

Кафедра сусветнай літаратуры
і культуралогіі

Репозиторий БарГУ

# Уладзімір Караткевіч
# і сучаснасць

*Зборнік артыкулаў*

Навапалацк
Выдавецтва "Полацкі дзяржаўны універсітэт"
2001

## ЗМЕСТ

### I


**Прадмова (А.А. Гугнін)** .......... 3

**А.Л. Верабей**. Гістарызм прозы Уладзіміра Караткевіча .......... 5

**А.М. Канапелька**. Мастацкая праўда гісторыі .......... 11

**А.П. Ніякоўская, Н.В. Ніякоўская**. У пошуках Айчыны (Да асноўных ідэй у творчасці Уладзіміра Караткевіча) .......... 16

**В.К. Шынкарэнка**. Шляхам Беларусі ў свет шырокі... (Нацыянальнае і агульначалавечае ў творчасці Уладзіміра Караткевіча) .......... 27

**Т.Р. Багарадава**. Праблема свабоды чалавека ў празаічных творах Уладзіміра Караткевіча .......... 34

**С.І. Красоўскі**. Паходжанне лірычнага героя паэзіі Уладзіміра Караткевіча. 39

**С.А. Вялюга**. Вобраз Радзімы ў творчасці Уладзіміра Караткевіча .......... 46

**У.А. Лобач**. Беларускі космас Уладзіміра Караткевіча .......... 52

**А.І. Зянько, Т.А. Зянько**. Уладзімір Караткевіч і яго жыццёвая пазіцыя..... 66

**Т.С. Нуждзіна**. Уладзімір Караткевіч – мастак і чалавек паводле яго эпісталярнай спадчыны .......... 77

**Г.С. Кунцікава**. Партрэт У. Караткевіча ў інтэрпрэтацыі У. Калесніка .......... 88


### II


**В.М. Лухверчык**. Вобраз педагога ў аповесці Уладзіміра Караткевіча «У снягах драмае вясна» .......... 93

**З.А. Паўлава**. «Быць сумленнем сваёй эпохі». (Аналіз верша Уладзіміра Караткевіча «Мой век») .......... 97

**Дз.Дз. Паўлавец**. Колер авы тон апелятыва вочы ў творчасці Уладзіміра Караткевіча .......... 105

**Н.В. Несцер**. Колеравыя азначэнні неба і мора ў аповесці У. Караткевіча «Чазенія» .......... 110

**С.М. Струкава**. Устарэлыя назвы роднасці і сваяцтва ў рамане У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» .......... 113

**С.М. Сарока**. Праблемы развіцця беларускай мовы ў XIX стагоддзі (Па старонках «Губернскіх ведомостей» і творах Уладзіміра Караткевіча) .......... 123


### III


**Е.А. Лявонава**. Алюзія на вобраз Хрыста ў рамане Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» і сусветная літаратурная традыцыя. 130


Репозиторий БарГУ

**Н.Г. Апанасовіч**. Тэма «гульні са смерцю» ў творчасці А. дэ Бальзака, О. Уайльда і У. Караткевіча (на прыкладзе твораў «Шагрэневая скура», «Партрэт Дарыяна Грэя», «Ладдзя роспачы»)........................ 143
**Г.М. Друк**. Канцэпт палявання ў аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» і ў нарысе В. Казько «Дзікае паляванне каралёў Сталіншчыны»........................ 148
**А.У. Сузько**. Мастацкая інтэрпрэтацыя антычнай скульптуры ў паэзіі М. Танка і У. Караткевіча........................ 155

**IV**

**Н.Б. Лысова**. Экранная інтэрпрэтацыя твораў Уладзіміра Караткевіча: жанравая своеасаблівасць........................ 162
**А.А. Никифоров**. О переводе одного стихотворения Владимира Короткевича на русский язык........................ 169
**Л.Б. Мілаш**. Уладзімір Караткевіч і Вільня........................ 173

**V**

**А.І. Барадзіна**. Метадычная інтэрпрэтацыя творчасці Уладзіміра Караткевіча ў святле актуальных праблем школьнай адукацыі........................ 176
**В.Дз. Мятла**. «Зямля пад белымі крыламі» У. Караткевіча на занятках па беларускай мове........................ 186
**А.І. Зянько**. «Быў. Ёсць. Буду.» Да вывучэння лірыкі Уладзіміра Караткевіча ў школе........................ 191

**ДАДАТАК**
**Кацярына Кітова**. Дзікае паляванне........................ 204
**Сяргей Красоўскі**. Светлай памяці Уладзіміра Караткевіча........................ 205
**Юрий Павлюк**. Памяти В. Короткевича........................ 206
Агна Ветер........................ 207
Витебску........................ 208
**Анатолий Зенько**. Короткевичу........................ 209

На старонках 210–211 змешчаны здымкі ўдзельнікаў канферэнцыі

Рэпазіторый БарДУ

**А.І. Барадзіна**
**Баранавіцкі дзяржаўны**
**вышэйшы педагагічны коледж**

# Метадычная інтэрпрэтацыя творчасці У. Караткевіча ў святле актуальных праблем школьнай літаратурнай адукацыі

Школьнае навучанне і выхаванне – дакладная мадэль праблем і супярэчнасцяў грамадства, а навучальныя праграмы – адбітак грамадскіх адносін. На працягу дзесяцігоддзяў літаратура была арэнай класава-ідэалагічнай барацьбы, вычувала на сабе засілле вульгарызацыі і сацыялагізацыі. Каштоўнасць літаратурнага твора вызначалася не ўзроўнем мастацкага мыслення, а пэўнасцю і выразнасцю адкрытай ідэалагічнай скіраванасці ці, з другой паловы 60-х гадоў, апалагетызацыя сучаснага (у сэнсе надзённа-кан'юнктурнага). На гэтым этапе выявілася няўвага да гістарычнай тэматыкі, як ігнараванне мінулага і пагарджанне ім, у выніку чаго адбывалася размыванне гістарычнай свядомасці моладзі, бо сувязь пакаленняў забяспечваецца праз перадачу чалавечага вопыту пры дапамозе разнастайных форм і сродкаў, у тым ліку і сродкамі мастацкай літаратуры. Праблема фарміравання гістарычнай свядомасці набыла асаблівую актуальнасць у пераломны момант развіцця нашага грамадства, у перыяд акрэслівання яго гістарычнай перспектывы. Веды аб мінулым у структуры гістарычнай свядомасці выступаюць як фундамент устаноўкі на пазнанне сучаснасці і на вызначэнне перспектыў развіцця. Аднак інфармацыя яшчэ не ёсць ісціна, таму фарміраванне дадзенага феномена, як выхаваўчая мэта, патрабуе ўзмацнення эмацыянальна-афектыўнага аспекту навучання, што адпавядае эстэтычнай прыродзе і зместу літаратуры як вучэбнага прадмета. Новае пакаленне школьных праграм дае для гэтага багатыя магчымасці, дыялектычна спалучаючы агульначалавечы падыход з выяўленнем нацыянальнай адметнасці беларускай гісторыі, што з'яўляецца стрыжнем выхавання чалавека-грамадзяніна, патрыёта, гуманіста.

Вырашаючы задачы фарміравання гістарычнай свядомасці, мы тым самым уплываем і на іншыя пласты свядомасці асобы, бо нацыянальная, гістарычная, патрыятычная і грамадзянская свядомасць дыялектычна ўзае-

мазвязаны і ўваходзяць у структуру грамадскай свядомасці. Грунтуючыся на агульначалавечых каштоўнасцях і ствараючы перадумовы для самарэалізацыі асобы, гэты працэс ёсць таксама і працэс фарміравання гуманістычнай свядомасці, або духоўнасці, – здольнасці асобы прадстаўляць свой час, народ, нацыянальную культуру, этнас і соцыум. Пры належнай метадычнай інтэрпрэтацыі творы гістарычнай тэматыкі, якія шырока прадстаўлены ў сучасных школьных праграмах, уяўляюцца дзейсным сродкам барацьбы супраць «рэтраграднай амнезіі», сацыяльнай хваробы сённяшняга грамадства. Прыярытэтная роля адводзіцца творам У. Караткевіча, заснавальніка гістарычнай тэмы ў сучаснай беларускай літаратуры, які, па сутнасці, узнавіў у памяці беларусаў іх уласную гісторыю. Напісаны У. Караткевічам мастацкі летапіс жыцця і лёсу беларускага народа – фактар фіксацыі і развіцця гістарычнай свядомасці сучаснага і наступнага пакаленняў. Дбаючы аб грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі, пісьменнік імкнуўся ўдасканальваць як змест, так і форму сваіх твораў. Ёсць усе падставы сцвярджаць, што яны напісаны як бы навырост, маючы на ўвазе іх здольнасць задаволіць любы мастацкі густ, адпавядаць духоўным запатрабаванням асобы на кожным этапе яе развіцця. З улікам гэтага ажыццяўляўся падбор твораў У. Караткевіча ў сучасных школьных праграмах.

Дзейнасць настаўніка грунтуецца на асаблівасцях чытацкай свядомасці школьнікаў Так, на этапе «наіўнага рэалізму» (5–6 класы) стымулюецца эмацыянальная актыўнасць вучняў, якая пракладвае шлях да складаных інтэлектуальных дзеянняў («эмацыянальнае абуджэнне розуму»), спрыяе ўзнікненню сімпатыі; фарміруецца здольнасць да цэласнага ўспрымання твора. Улічваючы інтэнсіўнае фарміраванне свядомасці падлеткаў, варта мэтанакіравана ўплываць на станаўленне іх грамадзянскай пазіцыі. Пэўныя цяжкасці звязаны з тым, што пры «наіўным рэалізме» эмоцыі чытача звычайна ярчэй за славесныя ацэнкі пачуццяў. Пераадоленню такой неадэкватнасці, абумоўленай малым вопытам рэфлексіі і неразвітасцю мовы, служыць, у прыватнасці, складанне тэматычнага слоўніка «Пачуцці». Разнастайнасць прыёмаў і сродкаў паказу жыцця ў паэтычным творы выяўляецца пры выкарыстанні прыёму мантажу тэксту з россыпу слоў (1), які ставіць вучня ў пазіцыю аўтара і творцы, развівае навыкі аналізу і сінтэзу, а па выніках яго настаўнік здольны меркаваць пра наяўнасць літаратурных і творчых здольнасцяў навучэнцаў, развіваючы іх у далейшай дзейнасці адпавядна патрабаванням часу.

Адзін з галоўных кампанентаў любога ўрока – даследаванне аўтарскай пазіцыі як сродак вырашэння праблем, пастаўленых пісьменнікам, і як адзін з напрамкаў гуманізацыі (увага да асобы: вучня, літаратурнага героя,

пісьменніка, настаўніка як пасрэдніка паміж аўтарам і чытачом). Паведамленне звестак з біяграфіі пісьменніка скіравана на першапачатковае асэнсаванне такіх каштоўнасцяў, як радзіма (малая і вялікая), яе гісторыя; сям'я і сямейная гісторыя як частка гісторыі Радзімы; родная прырода; культура; творчасць.

Высокім выхаваўчым патэнцыялам валодаюць казкі У. Караткевіча, дзякуючы ўвазе пісьменніка да дынамікі ўнутранага стану герояў, даследаванню незвычайных з'яў пры адсутнасці залішняга маралізатарства. Мастацкі вопыт пісьменніка, спалучаны з лепшымі традыцыямі народнай педагогікі, спрыяе фарміраванню свядомасці чытача, выхоўваюць любоў да Радзімы, павагу да продкаў. Аналіз казачнай формулы, каменціраванае чытанне, разнастайныя прыёмы метаду творчага чытання даюць магчымасць «не толькі суперажываць з героямі, але і глядзець на твор у цэлым, заўважаць і ацэньваць некаторыя асаблівасці эстэтычнай формы, радавацца майстэрству пісьменніка – дакладнасці і трапнасці яго слова, веданню чалавека і прыроды, гумару» (2, 101). Пачуццё гумару суб'ектыўна – гэта асабістая рыса У. Караткевіча, а аб'ектыўна – спецыфічны выхаваўчы сродак, які здольны аб'яднаць радаснае здзіўленне са спачуваннем, перажываннем, шкадаваннем. Прырода смеху гуманістычная, дасціпнасць узбагачае асобу, бо мае на ўвазе эрудыцыю, добры эстэтычны густ, здольнасць аналізаваць і параўноўваць. Прывіць пачуццё гумару нельга, але развіваць яго, дбаючы пра «мастацтва спасцігаць мастацтва», неабходна. Мэта казачнікаў – выхаваць у дзіцяці чалавечнасць. Яе рэалізацыі спрыяе, у прыватнасці, работа з фальклорнымі элементамі (прыказкамі, прымаўкамі, устойлівымі выразамі), якія і працуюць на вырашэнне выхаваўчых задач, і адначасова вобразна адлюстроўваюць рэчаіснасць. Акрамя таго, прыём падбору да беларускіх прымавак і прыказак адпаведных узораў усходняй мудрасці («Лебядзіны скіт») дапамагае першаснаму асэнсаванню дыялектыкі нацыянальнага і агульначалавечага. Выразы розняцца стылем, але маюць агульны змест. Каменціраванае чытанне («Едзем з гэтай страшнай зямлі, дзе плачуць нават камні і змагаюцца нават слабыя») – спроба асэнсавання феномена нацыянальнага характару. Аналіз казак дае магчымасць увесці паняцці «гістарычны час» і «мастацкі час» праз прыёмы інтэграцыі з курсам «Мая радзіма – Беларусь» і паглыбленую ўвагу да тэксту («Нямоглы бацька»), у выніку чаго вымалёўваецца агульная канцэпцыя гістарычнага шляху народа, дзе нягод было больш, чым радасцей. А выраз «Знішчалі »ўчора» і таму не мелі права на «заўтра» ўяўляе сабой не што іншае, як мастацкую формулу гістарычнай свядомасці.

Вучні 5 класа павінны ўмець складаць план твора ці ўрыўка з яго. Пры нятворчым выкладанні гэты прыём універсалізуецца і замяняе сабою іншыя, развіваючыя. Эфектыўнай з'яўляецца работа з тэкстам па апорах, у якасці якіх выступаюць арыгінальныя моўныя канструкцыі («рыхтуйся ваўкоў гадаваць», «насіце на руках бацькоў»), што абумоўлівае яго выбарачна-скіраванае вывучэнне і звязана з пільнай увагай да слова ў кантэксце. Падобныя прыёмы ў выніку прыводзяць да ўсведамлення этнамовы ў якасці агульначалавечай каштоўнасці. Адной з дамінант гістарычнай свядомасці з'яўляюцца адносіны да экалагічнай сферы Радзімы. У творах У. Караткевіча адчуваецца не толькі радасць ад адзінства з прыродай, але і затоеная трывога за яе лёс. Асэнсаванне гэтага адбываецца на ўсім шляху аналізу («Бурык») праз прыёмы работы над словам у непарыўнасці двух яе відаў, лексічнага і арфаграфічнага. «Спадарожнае навучанне» (3) выхоўвае культуру мовы і ўвагу да слоў і выразаў, што выключае павярхоўнае стаўленне да тэксту. Гэта замена фразеалагізмаў з тэксту сінанімічнымі выразамі, падбор аднакарэнных слоў да слоў «мядзведзь» і «лес» і правільнае іх напісанне; падбор сінонімаў да слоў «нетры», «кленчыць», «карбач» і інш. Акрамя адчування слова, настаўнік абуджае ў вучняў здольнасць да сімпатыі, а праз яе адбываецца зварот да рэфлексіі, якая фіксуе градацыю пачуццяў героя да свайго роднага кутка. Тэкст твора даследуецца на наяўнасць звестак пра бурага мядзведзя, якія супастаўляюцца з навуковай інфармацыяй, што актуалізуе веды вучняў пра стылі мовы. Творы У. Караткевіча на экалагічную тэму аказваюць выхаваўчае ўздзеянне на вучняў, дзякуючы ўвасобленай у адметным стылі выразнай аўтарскай пазіцыі, якая можа быць выяўлена шляхам пастаноўкі і вырашэння праблемных пытанняў, прыярытэтным у арсенале метадычных шляхоў на сучасным этапе, паколькі ён адпавядае мэтам фарміравання асобы з самастойным, творчым мысленнем у супрацьвагу асобе выканальніцкага тыпу – эталону папярэдняга сацыяльнага заказу.

Нарыс «Зямля пад белымі крыламі», як узор сінтэзу навуковага і мастацкага ведання, мае вялікую пазнавальную і выхаваўчую вартасць, дазваляе ўсвядоміць адметнасць і вытокі нацыянальнага характару, якімі абумоўлены розныя спосабы ўладкавання беларусамі свайго матэрыяльнага і духоўнага жыцця. Вывучэнне твора дае багатыя магчымасці для развіцця творчых і спецыяльна мастацкіх здольнасцяў вучняў (ілюстраванне, інсцэніраванне, складанне тэматычных слоўнікаў, вырашэнне праблемных сітуацый). Развіццё падлеткаў не можа зводзіцца толькі да сузірання, назірання, пасіўнага ўспрымання эстэтычных каштоўнасцей. Для гэтага ўзросту характэрна вялікае імкненне да самастойнай дзейнасці, самавыяўлення, што магчыма ва ўмовах мэтанакіраванай дзейнасці, якая выклікае станоў-

Репозиторий БарГУ

чыя эмоцыі. Твор спрыяльны для аб'яднання задач развіцця мовы і фарміравання правільнага пісьма (вольная дыктоўка «Беларуская хата»). Даследчы характар мае заданне растлумачыць выраз «куфар жыцця», у ходзе чаго змесціва куфра даследуецца з улікам здольнасцяў «практыкаў», «інтэлектуалаў», «творцаў». Першыя найбольш уважлівыя да прыватных фактаў, дэталяў, падрабязнасцяў; другія валодаюць ярка выражанымі аналітычнымі здольнасцямі; трэція – спецыяльна мастацкімі. Увогуле літаратура адносіцца да ліку тых прадметаў, дзе, на думку псіхолагаў, вельмі складана праводзіць унутраную дыферэнцыяцыю. Аднак вышэйзгаданы падыход дазваляе ў пэўных адносінах індывідуалізаваць літаратурнае навучанне. Амаль усе творы У. Караткевіча, ускосна ці непасрэдна, ставяць перад чытачом пытанне «Хто ты такі?» і патрабуюць адказу на яго або прапануюць варыянты такога адказу. Адказ на пытанні «Што за чалавек беларус? Што гэта за народ?» пабуджае вучняў да разваг, роздуму, перабудоўваючы каштоўнасна-сэнсавыя структуры асобы, ствараючы ўмовы для «тварэння» ўласнага ўнутранага свету на аснове выкарыстання духоўнага вопыту продкаў і здабыткаў нацыянальнай культуры.

Вывучэнне ў 6–7 класах лірычных і ліра-эпічных твораў У. Караткевіча спрыяе асэнсаванню далёкай і блізкай гісторыі Айчыны, садзейнічае фарміраванню ацэначных адносін да яе ў працэсе суаднясення, супастаўлення, параўнання, асацыятыўнага ўспрымання свету. Супадзенне таго, што шукае школьнік у пару духоўнага сталення, з тым, што ён знаходзіць у мастацкай літаратуры, стварае магчымасці актыўнага ўздзеяння на фарміраванне асобы. Арыгінальныя прыёмы каментарыю, аналітыка-сінтэтычная дзейнасць пры супастаўленні гістарычных і мастацкіх крыніц, празаічных і паэтычных твораў на тую ж тэму, рэалізацыя ўнутрыпрадметных сувязей, у тым ліку на канцэптуальным узроўні, аналіз пазіцый лірычнага твора, комплекснае ўздзеянне на розныя пачуццёвыя аналізатары ў працэсе вывучэння лірыкі, складанне «партытуры пачуццяў», прыём «двайнога перакладу» засведчылі, сярод іншых, сваю эфектыўнасць як сродкі развіваючага навучання на дадзеным этапе літаратурнай адукацыі. Падлеткавы ўзрост – гэта ўзровень «аўтаномнай маралі», самастойна выпрацаваных маральных прынцыпаў, калі асоба шукае ідэал у асяроддзі вядомых людзей гісторыі і сучаснасці. Асобы такога ўзроўню – героі апавядання «Паром на бурнай рацэ». Праблематыка твора, здавалася б, ужо вядомая сямікласнікам (гісторыя, Айчына, свабода...), але акцэнты расстаўлены інакш. Гісторыя народа – гэта найперш гісторыя роду, гісторыя сям'і. Прырода ў творы – дзеючая асоба. Ёй нададзена важная роля ў змаганні са злом, спрадвечнае сутыкненне якога з дабром увасоблена ў вобразе-сімвале «вераб'інай ночы».

Репозиторий БарГУ

Мастацкія біяграфіі герояў-антыподаў падаюцца ў супастаўленні, у прыватнасці, адносна падзей гэтай ночы, што падводзіць да выніку: У. Караткевіч любіць свой народ, але не ідэалізуе яго. Большыя сімпатыі ў вучняў выклікае рускі Гораў, а не беларус Пора-Леановіч, бо ён ваюе з тымі, хто змагаецца за свабоду Айчыны. Аналітычная дзейнасць школьнікаў дазваляе на заключных занятках абстрагавацца ад рэалістычнага вобраза парома і выявіць у сутнасці назвы, лёс чалавека ў часы буйных гістарычных падзей між берагамі Дабра і Зла.

Як пацвярджае практыка, тэндэнцыі эмацыянальнага росту і ўвагі школьнікаў да эстэтычнай формы, уласцівыя перыяду «маральнага эгацэнтрызму», знаходзяцца ў прамой залежнасці ад адпаведнасці зместу вывучаемых твораў індывідуальным асаблівасцям чытача. Інтраверта цікавяць творы з псіхалагічнай і філасофскай тканінай, яму імпануюць спакойнае ход падзей і дэталёвае адлюстраванне перажывання, роздуму і разважання пра жыццёвыя праблемы. Экстраверт больш цэніць творы, што вылучаюцца вастрынёй канфліктаў, эмацыянальнай выразнасцю, энергічнай, вольнай плынню апавядальнай манеры. Амбіверт аддае перавагу гістарычнаму і прыгодніцкаму раману. Прырода, нацыянальны побыт, нацыянальны характар, нацыянальныя традыцыі, адлюстраваныя ў літаратуры, не проста перадаюць асаблівасці таго ці іншага народа, а знаходзяць выражэнне ў творчай індывідуальнасці пісьменніка, створаным ім мастацкім свеце, у яго канцэпцыі жыцця і чалавека, якая павінна заўсёды быць у цэнтры ўвагі настаўніка. Эпічныя творы У. Караткевіча ў гэтым сэнсе здольныя задаволіць любы мастацкі густ, спалучаючы шматстайнасць формы з глыбінёй зместу і з'яўляючыся ў выніку сродкам спасціжэння чалавечага свету, далучэння да сацыяльна-гістарычнага вопыту свайго народа і чалавецтва.

У перыяд ранняга юнацтва цэнтральнае месца займае праблема ўзаемаадносін асобы і грамадства. Для гэтага перыяду характэрна інтэнсіўнае развіццё самасвядомасці, павышаецца адказнасць за свае паводзіны, за сваю будучыню. Асаблівасць ранняга юнацтва і ў павышанай успрымальнасці да маральнага і эстэтычнага ўздзеяння. З'яўляецца ўзмоцненая цікавасць да этычных праблем, а характар іх вырашэння выступае як крытэрый маральнага развіцця асобы; высокі інтарэс да «вечных» праблем: сэнсу жыцця, шчасця, абавязку, свабоды асобы. Акрамя таго, нельга не адзначыць складаную ў псіхолага-педагагічным плане сітуацыю (4): натуральнае імкненне гэтага ўзросту да рамантызму сёння сутыкаецца з прагматычнай арыентацыяй, спараджаемай эканамічнымі ўмовамі жыцця. А ў юнацтве немагчыма проста адмовіцца ад адной мэты на карысць другой. Таму важнейшая задача настаўніка, які працуе з гэтым узростам – пака-

Репозиторий БарГУ

заць, што на самай справе рамантычныя і прагматычныя ідэалы і каштоўнасці цалкам сумяшчальныя, што іх можна злучыць на ўзроўні вышэйшых чалавечых каштоўнасцяў; дапамагчы маладым людзям знайсці ў прагматычна арыентаваных герояў прывабныя маральныя і рамантычныя рысы, а ў рамантыкаў – карысныя дзелавыя якасці. Гэты аспект надзвычай поўна ўвасобіўся ў вобразах рамана «Каласы пад сярпом тваім», бо твор грунтуецца на пастаянных ідэях і каштоўнасцях, што сцвярджаюць універсальную значнасць чалавечага быцця ў цэлым і асобы ў прыватнасці. Высвятляючы дыялектыку рамантычнага і прагматычнага, нельга абысці паняцце прыватнай уласнасці, якая ў якасці агульначалавечай каштоўнасці сцвярджалася праз палеміку. Як паказваюць навейшыя даследаванні, уласнасць – не толькі эканамічная катэгорыя, а і элемент духоўнай і матэрыяльнай культуры, з'ява, якая без асобы не існуе і ўздзейнічае на яе як прадмет, як адносіны, як права і як каштоўнасць. Калі ўласнасць спрыяе развіццю асобы, то яна не павінна лічыцца несправядлівай, а ўяўляе сабой адзін з асноўных фактараў фарміравання асобы, перадумовы яе індывідуальнасці. Прыватны – значыць адпаведны аўтаноміі і свабодзе асобы. Прыдатнымі для сучаснасці могуць быць толькі маральныя, узвышанапатрыятычныя адносіны да ўласнасці. Іх узоры мы знаходзім ў гістарычным мінулым і ў літаратуры. Тып асобы-стваральніка, не спажыўца, не дачасніка, а мецэната, дабрачынніка, рамантыка, – адраджаецца і зараз як паўторная з'ява сацыяльнага жыцця. У рамане «Каласы пад сярпом тваім» мы бачым маральныя ўзоры такіх асоб, для якіх уласнасць не самамэта, а сродак вышэйшых маральных мэт. Яны здольныя аказваць уплыў на чытача. Зварот да гэтых аспектаў дазваляе забяспечыць прынцып навізны ў выкладанні нават пры выкарыстанні самых традыцыйных форм урока. Сістэма ўрокаў па раману:

1. У. Караткевіч у працы над раманам. Прычыны звароту да тэмы паўстання. Гісторыя стварэння рамана і асаблівасці яго пабудовы. «Геаграфія» рэальная і мастацкая, сувязь месца і часу ў мастацкім апавяданні.

2. Жыццёвыя назіранні і гістарычныя факты – аснова для стварэння вобразаў рамана. Сувязь і ўзаемадзеянне персанажаў. Супрацьстаянне высакароднага і ганебнага ў адлюстраванні шляхты.

3. Стыхія сялянскага жыцця ў рамане. Дыялектыка паняццяў «сялянства» і «народ». Народная аснова твора. Роля фальклору ў выяўленні яго ідэі. Аўтарскія адносіны да таго, што адлюстроўваецца.

4. Гістарычныя асобы ў рамане; іх месца, сувязь з іншымі вобразамі. Адзінства праўдзівасці і мастацкага вымыслу ў вобразах гістарычных асоб; аўтарская пазіцыя адносна іх.

Рэпазіторый БарДУ

5. Вобраз Алеся Загорскага як плён пошукаў У. Караткевічам ідэальнага героя; спалучэнне рамантычнага і прагматычнага ў асобе героя; «вечнасць» вобразаў, створаных пісьменнікам.

6. Духоўнае аблічча аўтара і праўда мастацтва, якая раскрывае рух жыцця, сувязь мінулага, сучаснага і будучыні, паказвае на гістарычным фоне заканамернасць лёсу чалавечага, лёсу народнага.

Абмеркаванне загалоўкаў рамана і яго частак і далейшае супастаўленне з тэкстам – вядучая форма работы на ўступных занятках. Другі аспект – аналіз прысвячэння і эпіграфаў, з якімі назва кантрастуе, бо яны маюць выразны сацыяльны сэнс. Апрацоўка назвы у думках – першы крок да высвятлення ідэі твора, свайго роду фармуляванне праблемы. Узнікае і такое праблемнае пытанне: чаму У. Караткевіч «забівае» пана Юрыя, высакароднага, сумленнага чалавека, і ў якой сувязі знаходзіцца гэта смерць са смерцю Стафана Кагута? На яго належыць адказаць, аналізуючы вобразы прадстаўнікоў шляхты і сялянства. Мэта заняткаў – даказаць, хто з герояў У. Караткевіча арыстакрат, а таксама выявіць гістарычныя супярэчнасці ў шляхецкім асяроддзі праз міжасабовыя зносіны герояў твора. Асноўны напрамак работы – ад факта да вобраза. Высветліўшы мастацкую прыроду вобраза Вежы, вучні з дапамогай настаўніка спасцігаюць яго філасофскі сэнс, прыходзячы да вываду, што гэтым вобразам У. Караткевіч сцвярджае прагрэсіўную ролю спалучэння традыцыі і наватарства. Вежа разумеў, «што адзіны спосаб не стаць непатрэбным – змяняцца да смерці і да смерці разумець новае, а калі не разумееш, нязлольны зразумець – ставіцца да яго з любоўнай верай» (V, 194). Групавая характарыстыка прадстаўнікоў сялянства складаецца на аснове індывідуальных характарыстык. Асноўныя лагічныя аперацыі, ажыццяўляемыя пры разважанні, – абстрагаванне і абагульненне. Асноўны тэзіс разважання: народ – творчая сіла. Асобныя групы вучняў характарызавалі вобразы Кагутоў, Корчака, Гелены, Кірдуна, Грыня Паківача, нянькі Тэклі, адзначаючы такія агульныя для іх рысы, як жыццёвая трываласць, працавітасць, мудрасць, маральнасць і духоўная чысціня, пачуццё ўласнай годнасці, свабодалюбства, таленавітасць, паэтычнасць душы. Разам з тым адзначаецца, што У. Караткевіч любіць свой народ, але не ідэалізуе сялянскую масу, якая была неаднароднай. Рухаючай сілай паўстання была шляхта, бо сялянства або ў сляпым радыкалізме адмаўляла саюз з ёю, або, як Стафан Кагут у рамане, лічыла за лепшае проста араць зямлю.

На пачуцці і свядомасць чытача лягчэй уплываць, калі творчасць пісьменніка будзе прыцягнута да творчасці іншых мастакоў слова. Ажыццяўленне ўнутрыпрадметных сувязяў ёсць тое, што называецца эўрыстычным метадам. Гэтак, як у «Знаку бяды» В. Быкава вобразы Петрака і Сце-



Рэпазіторый БарДУ

паніды, узаемадапаўняючыся і ўзаемаабагачаючыся, разбураюць хадзячае меркаванне пра беларуса як носьбіта спрадвечнай пакорлівасці, забітасці, так праз вобразы блізнят Андрэя і Кандрата Кагутоў У. Караткевіч сцвярджае, што філасофія паслухмянасці і пакоры зліваецца ў нацыянальным беларускім характары з філасофіяй бунту і пратэсту. У арыгінальнай мастацкай форме аўтар увасобіў наступную думку: у экстрэмальных умовах беларус пераадольвае дваістасць сваёй натуры і мабілізуе ўсе духоўныя і фізічныя сілы. Вучні падводзяцца да вываду, што народ – гэта прадстаўнікі ўсіх сацыяльных груп, ад князя да пастуха. У. Караткевіч сцвярджае гэту думку (не бяскрыўдную ў гады вульгарнага сацыялагізму) праз усведамленне Алеся, што «на гэтай зямлі не існавала іншых калыханак, акрамя мужычых» (V, 195). І гэта было «найлепшым доказам таго, што яны ўсе адно – ад яго і да апошняга мужыка» (V, 195). Такія прыёмы спрыяюць усведамленню гістарычнага адзінства нацыі ў «вертыкальным» часавым зрэзе, што ёсць адна з праяў гісторыка-патрыятычнай свядомасці. Галоўны герой рамана адрозніваецца ад звыклага нам станоўчага героя ў літаратуры. Ён – рамантычны герой у рамантычных абставінах. Каб выявіць прыгажосць гэтай асобы, духоўна багатай, маральна чыстай, з развітым эстэтычным пачуццём, з прагрэсіўнымі перакананнямі, ярка выяўленай грамадскай скіраванасцю, недапушчальна будаваць урок па збітым трафарэце, варта пазбягаць маралізатарства і ментарскіх акцэнтаў, якія звычайна нараджаюць у школьнікаў або скептыцызм, або проста адмоўнае стаўленне да прадмету гутаркі. Настаўнік павінен дабівацца ад вучняў выкарыстання спецыфічных сродкаў эстэтычнага аналізу, а не аргументаў жыцейскага парадку, так званага здаровага сэнсу. Пазбегнуць фармалізму на дадзеным уроку дапамагаюць такія віды даследчыцкай дзейнасці вучняў, як складанне «Анкеты Алеся Загорскага», яго «Кодэксу гонару», адказ на праблемнае пытанне «Якая з жанчын найбольш дастойная кахання Алеся Загорскага?» Гэтыя даследаванні дазваляць усебакова асвятліць асобу героя, для якога ўласцівы гонар і годнасць, удзячнасць за дабро, што яму зрабілі, імкненне ведаць свае карані, гісторыю, беражліва адносіцца да духоўнай спадчыны, працаваць, берагчы хлеб. З шэрагу іншых яго вылучае і нацыянальная самасвядомасць. Сутнасць героя вымяраецца каштоўнасцю, якую ён лічыць самай вялікай і ў імя якой гатовы на ўсё. Гэта – Радзіма. Герой не проста жыве ў рамантычных абставінах, ён імі выпрабоўваецца, што асабліва датычыць незакончанай гісторыі яго кахання да Майкі Раўбіч. Таму да месца былі элементы дыспуту адносна пытання «Ці будуць разам Алесь і Майка?» Яго вырашэнне было б немагчымым без аналізу тых дэталяў тэксту, якія ўказваюць на далейшы лёс герояў. Аднак узнаўленчай актыўнасці тут яўна

Рэпазіторый БарДУ

недастаткова. Неабходна самастойная інтэрпрэтацыя ідэйна-мастацкага прызначэння гэтых дэталяў, здольнасць «дамыслівання» таго, што адсутнічае ў аўтарскім тэксце. Безумоўна, аўтар рыхтаваў месца для Майкі побач з Алесем. Праява высокай эмацыянальнай культуры Алеся Загорскага – і ў яго паэтычным таленце, выспяванне якога вучні таксама прасочваюць праз канкрэтныя мастацкія дэталі. У значнай ступені змест вобраза і эстэтычныя рэакцыі ад яго ўспрымання адбіліся ў «эпісталярным дзённіку», старонкі з якога прапанавалася напісаць вучням у працэсе эксперыментальнага навучання.

Заключныя заняткі ўяўлялі сабой своеасаблівыя вучнёўскія чытанні, прысвечаныя асобе пісьменніка, асноўным праблемам і стылю яго творчасці. Гістарычнае веданне, эмацыянальныя і каштоўнасныя адносіны да мінулага, усведамленне яго ў якасці грунтоўнага падмурка сучаснасці і «матрыцы будучага» ўвасобіліся ў вучнёўскіх даследаваннях, якія стымулявалі творчыя пачаткі ва ўспрыманні імі твора мастацтва.

Творы У. Караткевіча з'уляюцца выдатнымі ўзорамі прозы, паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі. Пісьменнік у арыгінальнай форме сцвердзіў непераўзыходзячую каштоўнасць духоўнай культуры і гістарычнага мінулага беларускага народа, стварыў мастацкі летапіс яго жыцця, пашырыў галерэю тыпаў беларускага нацыянальнага характару. У працэсе вывучэння твораў У. Караткевіча скарыстоўваецца ўся сукупнасць метадаў, прыёмаў, шляхоў аналізу літаратурнага твора і арганізацыйных форм выкладання літаратуры. Асаблівую эфектыўнасць засведчылі кампазіцыйны шлях аналізу эпічнага твора, прыёмы даследчага і творчага характару, аналіз праблемных сітуацый, імітацыйна-мадэліруючыя гульні, дыспут, якія стымулююць пазнавальную актыўнасць і самастойнасць вучняў, спрыяюць самарэалізацыі і самасцвярджэнню асобы, пераўтварэнню пачуццяў і ўяўленняў у перакананні, тым самым непасрэдна ўплываючы на фарміраванне свядомасці, што служыць удасканаленню здольнасці асобы арыентавацца ў сучасным супярэчлівым свеце з улікам сацыяльнага вопыту папярэдніх пакаленняў і вызначаць уласнае месца ў соцыуме.

---

[1] *Рожина Л.Н., Лобанов А.П.* Развитие творческого мышления и творческих способностей учащихся на уроках литературы. // Адукацыя і выхаванне. 1997. № 11.

[2] Методика преподавания литературы. Под ред. О.Ю. Богдановой, В.Г. Маранцмана. В 2-х ч Ч. 2. М., 1994.

[3] *Иванихин В.В.* Почему у Ильина читают все?: Книга для учителя. М., 1990.

[4] *Немов Р.С.* Психология. В 3-х кн. Кн. 2. Психология образования. М., 1995.



Рэпазіторый БарДУ